


# Новы погляд на калабарацыянізм і партызанскі рух

“Партызанская рэспубліка”... У гэтай назве Беларусі часоў Другой сусветнай вайны адлюстравалася ўсё: і выдатныя ўмовы для вядзення “малой вайны”, і вялікая колькасць партызанскіх атрадаў, і гераізм “народных мсціўцаў” у барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Называючы так нашу краіну, гісторыкі і публіцысты нібыта мелі на ўвазе, што ўсе без выключэння жыхары альбо былі “народнымі мсціўцамі”, альбо спачувалі ім. Аднак сёння ўжо не сакрэт, што акрамя партызан былі і тыя, хто свядома ішоў на супрацоўніцтва з ворагам у імя нейкіх сваіх мэт.




Кнігу ўкраінскага гісторыка Алега Раманько “Коричневые тени в Полесье. Белоруссия 1941—1945”* можна лічыць свайго роду запрашэннем да канструктыўнага абмеркавання гісторыі калабарацыянізму. На наш погляд, рэцэнзуемае выданне адрозніваецца ад папярэдняй літаратуры па дадзенай праблеме па шэрагу пазіцый. У першую чаргу адзначым, што гісторыя беларускага калабарацыянізму нідзе не разглядаецца так падрабязна і ўсебакова, як у кнізе А.Раманько. Аўтару ўдалося раскрыць цесную сувязь і залежнасць беларускага калабарацыянізму ад палітыкі нацысцкага кіраўніцтва ў гады Другой сусветнай вайны. Ён вызначыў два этапы акупацыйнай палітыкі ў адносінах да калабарацыянізму — з чэрвеня 1941 г. па снежань 1942 г. і са студзеня 1943 г. да канца вайны.

У кнізе паказана роля беларускага нацыяналізму ў працэсе стварэння беларускіх калабарацыяніцкіх фарміраванняў, расказана аб арганізацыі і баявым прымяненні калабарацыяніцкіх фарміраванняў на тэрыторыі Беларусі ў 1941—1944 гг., а таксама ў эміграцыі ў 1944—1945 гг. Аўтар кнігі выказвае новы погляд на характар і напрамкі руху Супраціўлення на тэрыторыі Беларусі ў 1941—1944 гг., якія рэзка разыходзіцца з матэрыяламі вучэбных дапаможнікаў для школьнікаў і студэнтаў.

А.Раманько адзначае, што ў гады Другой сусветнай вайны ў руху Супраціўлення ўсіх акупіраваных нацыстамі краін Еўропы існавалі два напрамкі, якія ўмоўна можна назваць *камуністычным* і *нацыяналістычным*. Прадстаўнікі савецкай гістарыяграфіі гэта прызнавалі, аднак адмаўляліся бачыць некамуністычны рух Супраціўлення на акупіраваных тэрыторыях СССР. Далей А.Раманько піша: “Тем не менее следует признать, что с 1941 по 1944 год на территории этой республики (Беларусі. — **Э.І.**) действовал целый ряд партизанских отрядов, члены которых уж никак не считали себя адептами коммунистической идеологии и сторонниками советского государства, а зачастую числили их своими врагами наряду с гитлеровцами. Так, наряду с общепризнанным прокоммунистическим партизанским движением можно выделить:

— польское националистическое партизанское движение в лице так называемой Армии Крайовой (АК) — подпольных вооруженных сил под обшим руководством польского эмигрантского правительства в Лондоне;

— украинское националистическое партизанское движение в лице так называемой Украинской повстанческой армии (УПА) — подпольных вооруженных сил различных организаций украинских националистов;

— белорусское националистическое партизанское движение” (с. 116).

У спасылцы да гэтага матэрыялу А.Раманько адзначае, што акрамя гэтых арганізацый існавалі

* Романько О.В. Коричневые тени в Полесье. Белоруссия 1941—1945. М., 2008. — 432 с.

яшчэ літоўскія і яўрэйскія партызанскія атрады, аднак прыкметнай ролі ў гісторыі партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі яны не адыгралі (с. 416).

Такім чынам, аўтар даследавання называе ўсе сілы, якія дзейнічалі на акупіраванай тэрыторыі Беларусі. Больш за тое, ён імкнецца да аб'ектыўнага разгляду праблемы беларускага калабарацыянізму, падкрэслівае, што нельга ні прыніжаць ролю беларускіх калабарацыяністаў, зводзячы іх да ўзроўню звычайных здраднікаў, ні ўзнімаць гэтую ролю да такіх вышынь, якой яна не мыслілася нават самім калабарацыяністам (с. 5). Пагодзімся з аўтарам у яго сцвярджэнні, што ісціна ляжыць недзе пасярэдзіне.

Спасылаючыся на артыкул украінскага даследчыка Т.Гунчака "У мундирах ворога" (1993), А.Раманько адзначае, што на працягу Другой сусветнай вайны ў германскіх узброеных сілах прайшлі службу 1,3—1,5 млн савецкіх грамадзян, большасць добраахвотна, астатнія ж — у выніку розных прызыўных кампаній. Акцэнтуючы ўвагу чытачоў на тым, што працэс стварэння і выкарыстання беларускіх добраахвотніцкіх фарміраванняў быў у цэлым падобны на аналагічныя працэсы ў іншых частках СССР, аўтар рэцэнзуемай кнігі слушна заўважае, што праявіліся ў ім і адрозненні, абумоўленыя передваенным развіццём Беларусі і асаблівасцямі акупацыйнага рэжыму (с. 18).

Калі палітыка партыі бальшавікоў у вырашэнні беларускага пытання была спачатку лаяльная ў адносінах да нацыяналістаў, то ў Польшчы ўсё было наадварот. Афіцыйная Варшава разглядала беларусаў не як асобны народ, а як нацыянальную меншасць, якую неабходна асіміляваць. Як вынік, уся гісторыя Заходняй Беларусі 1920—1930-х гг. была напоўнена барацьбой за нацыянальнае выжыванне. У такіх умовах многія з лідэраў беларускага нацыянальнага руху з надзеяй глядзелі на СССР, дзе беларуская нацыя атрымала магчымасць пабудаваць нацыянальную дзяржаву на сацыялістычнай аснове — у выглядзе БССР.

А.Раманько адзначае, што напярэдадні Другой сусветнай вайны беларускі нацыянальны рух Заходняй Беларусі аказаўся расколатым на некалькі плыней. Найбольш значнымі з іх былі: так званая "незалежніцкая" плынь, на правым флангу якой знаходзілася Беларуская нацыянал-сацыялістычная партыя Фабіяна Акінчыца; невялікая плынь так званых "паланафілаў"; члены нелегальнай Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі і іх беспартыйныя прыхільнікі.

Заслугоўвае ўвагі думка аўтара кнігі, што асноўныя вехі гісторыі беларускага нацыяналізму першай паловы XX ст. паказалі гатоўнасць яго лідэраў да супрацоўніцтва з любой сілай, якая б дапамагла ім усталяваць сваю ўладу ў Беларусі. Менавіта таму яны вырашылі падтрымаць Германію, нават не ведаючы ўсёй сутнасці ідэалогіі нацыянал-сацыялізму адносна славянскіх народаў і ўсіх перыпетый той барацьбы, якая ішла паміж рознымі групоўкамі ў германскім ваенна-палітычным кіраўніцтве. Узамен лідэры нацыяналістаў спадзяваліся атрымаць палітычную ўладу ў Беларусі, паступова ўрастаючы ў акупацыйны апарат. Аднак да 1943 г. у нацыстаў былі свае меркаванні адносна беларускіх нацыяналістаў. Нягледзячы на актыўны ўдзел нацыяналістаў у падтрымцы акупацыйнага рэжыму і стварэнне органаў мясцовага самакіравання, нацысты не збіраліся дзяліць з імі ўладу. У 1941—1942 гг. не магло быць нават гаворкі аб стварэнні якіх-небудзь сур'ёзных палітычных арганізацый і тым больш передачы ім улады ў мясцовых органах кіравання.

Бадай, самай цікавай главой кнігі з'яўляецца другая глава "Белорусский национализм и его роль в процессе создания белорусских коллаборационистских формирований". Тут выказваецца думка, што камуністычны партызанскі рух быў найбольш арганізаваны і абапіраўся на цвёрды ідэалагічны падмурак. Польскі рух і ўкраінскі саступалі яму ў плане знешняй падтрымкі, але не ў ідэалогіі. Воіны АК былі ўпэўнены, што змагаюцца за вызваленне Польшчы як ад нацыстаў, так і ад камуністаў, а паўстанцы УПА ведалі, што вядуць барацьбу за стварэнне "саборнай і незалежнай Украіны". Аднак у падтрымцы насельніцтва яны відавочна прайгравалі "чырвоным" партызанам. Прычынай гэтага аўтар лічыць не слабасць іх ідэалогіі, а непрыняцце многіх яе палажэнняў беларускімі людзьмі. Так, галоўная мэта барацьбы АК — аднаўленне Польшчы ў граніцах да 1 верасня 1939 г. — не знайшла падтрымкі ў простага народа. Яшчэ менш зразумелай для беларусаў была ідэалогія ўкраінскіх нацыяналістаў (с. 125).

Шмат роздумаў навявае заключэнне "Вместо послесловия" пасля чацвёртай главы "Белорусские коллаборационистские формирования в эмиграции (1944—1945): Организация и боевое применение". Цяжка сказаць, лічыць А.Раманько, ці быў асабісты склад якога-небудзь з добраахвотніцкіх фарміраванняў сапраўды прасякнуты беларускай нацыянальнай ідэяй. Хутчэй за ўсё гэтую ідэю падзялялі некаторыя беларускія афіцэры і унтэр-афіцэры, якія і імкнуліся распаўсюдзіць яе сярод радавых. Аднак такіх "свядомых патрыётаў" было вельмі мала. У кнізе робіцца высновa, што адзінай часцю, якая ў цэлым мела беларускі нацыянальны характар, трэба лічыць Навагрудскі кавалерыйскі эскадрон пад камандаваннем Барыса Рагулі. Дарэчы, гэта было адзінае беларускае калабарацыяністкае фарміраванне, пры стварэнні і выкарыстанні якога немцы выканалі ўсе свае абяцанні. І ў гэтым, як адзначае А.Раманько, заключаецца яго свайго роду унікальнасць.

Нельга не пагадзіцца з аўтарам рэцэнзуемай кнігі ў тым, што найбольш вострым пытаннем гісторыі ўсіх калабарацыяністкіх фарміраванняў з'яўляецца іх удзел у рэпрэсіях супраць мірнага насельніцтва. У той жа час цяжка прыняць такую яго пазіцыю: "Белорусской полиции, естественно, приходилось участвовать и в уничтожении еврейского населения. Тем не менее большинство историков склонны утверждать, что это также не выходило за рамки "обыч-

ных” проявлений оккупации. В целом уровень антисемитизма в Белоруссии был значительно ниже, чем, например, на Украине, и белорусское население “не прославилось” массовыми антиеврейскими эксцессами, как, например, в Прибалтике” (с. 294).

Спынімся на гэтым урыўку з кнігі падрабязней. Можна згадзіцца з тым, што агульны ўзровень антысемітызму ў Беларусі быў значна ніжэйшы, чым на Украіне і ў Прыбалтыцы. Таксама згаджаюся са сцвярджэннем аб удзеле беларускай паліцыі ў знішчэнні яўрэйскага насельніцтва, таму што гэта адпавядае жахлівай рэчаіснасці таго часу. Аднак здзіўленне выклікае фраза, што “большинство историков склонны утверждать, что это (удзел беларускай паліцыі ў знішчэнні яўрэйскага насельніцтва. — **Э.І.**) также не выходило за рамки “обычных” проявлений оккупации” (с. 294). Лічу, што такая думка сведчыць аб адыходзе аўтара рэцэнзуемай кнігі ад прынцыпу аб’ектыўнасці і нават аб яго прафесіянальнай бездапаможнасці, слабым знаёмстве з архіўнымі матэрыяламі аб Халакосце і генацыдзе яўрэйскага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі ў 1941—1944 гг. З тэксту незразумела, пра якую “большасць гісторыкаў” гаворыць аўтар і чаму ён не называе ніводнага прозвішча. Застаецца адкрытым і пытанне пра тое, што аўтар разумее пад “звычайнымі” праявамі акупацыі. Што гэта за праявы, у выніку якіх нацыстамі і іх пасобнікамі — беларускімі, літоўскімі, украінскімі, латышскімі, рускімі, эстонскімі і польскімі калабарацыяністамі на тэрыторыі Беларусі было знішчана 805 тыс. яўрэяў, у тым ліку каля 90 тыс. з сямі краін Еўропы? Лічу, што ў гэтым пытанні аўтар кнігі не пазбегнуў ідэалізацыі дзеянняў беларускай паліцыі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Разглядаючы прычыны, якія абумовілі нізкую баяздольнасць асобных беларускіх добраахвотніцкіх фарміраванняў, А.Раманько вылучае дзейнасць розных нямецкіх інстанцый і ўплыў партызанскага руху (прычым не толькі савецкага) (с. 292—293). Ён лічыць, што “беларусіфікацыя” акупацыйнага апарату была толькі адным з напрамкаў дзейнасці нацыяналістычнага падполля. Другім, прычым не менш важным, стала стварэнне Беларускага народнага партызанскага руху (Беларускай народнай партызанкі (БНП)) (с. 131).

Хутчэй за ўсё першым партызанскім атрадам, створаным беларускімі нацыяналістамі, была так званая “акцыя” Уладзіміра Шавеля. У пачатку 1942 г. супрацоўнік абвера, начальнік беларускай паліцыі Мінскай акругі, член кіраўніцтва Беларускай народнай самапомачы, які даволі паспяхова змагаўся супраць “чырвоных” партызан, нечакана сабраў сваіх людзей і адвёў у лес на ўсход ад Барысава. Да нашага часу невядома, была гэта акцыя вынікам рашэння ЦК БНП альбо У.Шавель праявіў асабістую ініцыятыву. Так ці інакш, але зімой—вясной 1942 г. быў створаны першы партызанскі атрад менавіта нацыяналістычнай накіраванасці. Хутка да У.Шавеля далучыўся бургамістр гарадскога пасёлка Беразіно Анатоль Сакалоў. Разам яны прыступілі да вярбоўкі добраахвотнікаў і пачалі выдаваць на ратататары падпольную газету. Хутка на дзейнасць нацыяналістаў звярнулі ўвагу савецкія партызаны, якія прапанавалі У.Шавелю сустрэчу. Яна скончылася трагічна: У.Шавель і яго памочнікі былі знішчаны, выратавацца ўдалося толькі А.Сакалову. Радавыя ж члены нацыяналістычнага партызанскага атрада папоўнілі шэрагі савецкіх партызан. Прыводзячы гэты эпізод, А.Раманько спасылаецца на артыкул С.Ёрша “Беларускі нацыянальны рэзыстанс у гады Другой сусьветнай вайны” (Пагоня. 1995, № 34).

Аўтар кнігі падкрэслівае, што больш-менш значны нацыяналістычны партызанскі рух узнік толькі на тэрыторыі Заходняй Беларусі, хоць спробы яго арганізацыі былі і ў цэнтральнай частцы рэспублікі. Аднак тут ён адразу ж быў знішчаны савецкімі партызанамі.

Партызанскі фактар значна паўплываў на працэс стварэння і баявога прымянення беларускіх часцей. З усіх савецкіх, польскіх, украінскіх, яўрэйскіх і літоўскіх партызанскіх атрадаў найбольшы ўплыў на беларускія добраахвотніцкія часці аказалі першыя тры катэгорыі, прычым з рознай ступенню выніковасці. Аўтар адзначае, што толькі ўздзеянне савецкага партызанскага руху было найбольш істотнае і сапраўды змагло паўплываць на працэс стварэння і выкарыстання беларускіх добраахвотніцкіх фарміраванняў. Роля ж беларускага нацыяналістычнага партызанскага руху ў цэлым і яго ўплыў на добраахвотніцкія падраздзяленні ў прыватнасці былі нязначныя.

Адзначаючы шматлікія вартасці рэцэнзуемай кнігі, нельга не звярнуць увагу і на яе недахопы.

1. Пры правядзенні даследавання аўтар кнігі не выкарыстаў архівы Расіі, Украіны (за выключэннем Дзяржаўнага архіва Аўтаномнай Рэспублікі Крым (г. Сімферопаль), Польшчы і Літвы.

2. На с. 53 кнігі гісторыя Вялікага княства Літоўскага вызначаецца XIV—XVIII стст. На самой справе ўтварэнне ВКЛ з цэнтрам у Навагрудку адносіцца да 1240-х гг., г.зн. да XIII ст. Між іншым, пры высвятленні гісторыі беларускага калабарацыянізму часоў Вялікай Айчыннай вайны не абавязкова даследаваць гісторыю Вялікага княства Літоўскага.

3. На гэтай жа старонцы кнігі сцвярджаецца: “Возникновение же белорусского национализма как такового относится его идеологами ко времени Польского восстания 1863 года... Дело в том, что в ходе его поляки впервые предприняли попытку восстановить против русских властей белорусское крестьянство. Этим делом занимался “диктатор Литвы” Константин Калиновский...”.

Як вядома, беларускі нацыяналізм цесна звязаны з беларускім нацыянальна-вызваленчым рухам. Прывядзём думку аўтарытэтнага беларускага вучонага па гэтай праблеме Аляксея Каўкі: “Зыходным пунктам у гісторыі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху было паўстанне 1794 у Польшчы, на Беларусі і ў Літве пад кіраўніцтвам Т.Касцюшкі супраць гвалтоўнага падзелу Рэчы Паспалітай манархамі Расіі, Аўстрыі і Прусіі, далучэння зямель Бела-

русі да Расіі. Паводле ўзроўню нацыянальнай самасвядомасці, якаснай эвалюцыі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў яго гісторыі ўмоўна вылучаюць два асноўныя этапы: пачаткова-падсвядомага руху "ў сабе", здзейсненага пераважна ў рамках польскага нацыянальна-вызваленчага працэсу (1794—1863), і руху "для сябе", усведамленнем уласна беларускіх нацыянальных інтарэсаў і канчатковай мэты — адраджэння беларускай дзяржаўнасці (1863—1918)" (Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 1. Мн., 1993. С.445).

4. На с. 63—64 кнігі А.Раманько піша: "После Рижского мира между Польшей и Советской Россией (март 1921 года) большая часть Белоруссии осталась в составе СССР, где была создана Белорусская Советская Социалистическая Республика (БССР) со столицей в Минске. К Польше же отошла ее западная часть с городами Гродно, Барановичи, Белосток, Брест и Пинск. Помимо этого, небольшая часть белорусских земель была присоединена ко вновь образованным Литовской и Латвийской республикам". Гэтая інфармацыя недакладная і няпоўная. Дастаткова адзначыць, што паводле адміністрацыйнага падзелу Польшчы гэта тэрыторыя была падзелена на 29 паветаў, што ўваходзілі ў склад чатырох ваяводстваў: Беластоцкага, Віленскага, Навагрудскага і Палескага. Нічога не гаворыцца пра тое, што Гомельская губерня, а таксама значная частка Віцебскай і Магілёўскай губерняў уваходзілі тады ў склад РСФСР. Тэрыторыя Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі (ССРБ) уключала ўсяго 6 паветаў Мінскай губерні.

5. На с. 65 кнігі сцвярджаецца: "После объявления амнистии и провозглашения политики "белорусcизации" в БССР вернулись многие бывшие деятели БНР (например, В.Игнатовский, Я.Лёсик, А.Смолич, В.Ластовский и другие), которые почти сразу же включились в проведение этой политики". Аднак з пералічаных асоб вярнуўся толькі В.Ластоўскі (у 1927 г.), які быў прызначаны дырэктарам Беларускага дзяржаўнага музея, загадчыкам кафедры этнаграфіі пры Інбелкульце. У.Ігнатоўскі і Я.Лёсік нікуды не ад'язджалі з БССР, а А.Смоліч вярнуўся ў Савецкую Беларусь яшчэ ў 1922 г.

6. Ацэньваючы колькасць беларускіх савецкіх партызан, А.Раманько піша, што ўсяго за перыяд з 1941 па 1944 гг. праз партызанскія атрады на тэрыторыі Беларусі прайшлі больш за 440 тыс. чалавек (с. 119). Нашы афіцыйныя даныя падаюць наступную лічбу — больш за 374 тыс. чалавек (Республика Беларусь. Энциклопедия. Т. 1. Мн., 2005. С. 339).

На с. 125 кнігі адзначаецца, што на тэрыторыі Беларусі ў час вайны дзейнічалі 14 тыс. байцоў Арміі Краёвай. Беларускія і польскія даследчыкі прыводзяць лічбу ў 50 тыс. чалавек (з улікам Беластоцкай вобласці). На той жа старонцы аўтар кнігі прыводзіць лічбу ўдзельнікаў УПА на тэрыторыі Палесся ў 12 тыс. чалавек. Паводле даных беларускіх і ўкраінскіх даследчыкаў, на самой справе на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі каля 25 тыс. членаў Украінскай паўстанцкай арміі.

А.Раманько называе лічбу ўдзельнікаў Беларускага народнага партызанскага руху — каля 3 тыс. чалавек (на пачатак чэрвеня 1942 г.) За ўвесь час Вялікай Айчыннай вайны, як лічаць беларускія даследчыкі, іх сапраўдная колькасць вагалася ад 3 да 5 тыс. чалавек.

7. Дзіўна, што спецыяліст па партызанскаму руху на тэрыторыі Беларусі Алег Валянцінавіч Раманько не ведае імя па бацьку начальніка Цэнтральнага штаба партызанскага руху П.К.Панамарэнкі. Яго звалі Панцеляймон Кандратавіч, а не Панцеляймон Кузьміч, як надрукавана на с. 117.

8. На с. 132 гаворыцца пра бургамістра горада Беразіна Анатоля Сакалова. Тут адразу допушчаны дзве недакладнасці — у назве (Беразіно, а не Беразін) і статусе пасялення (гарадскі пасёлак, а не горад).

9. На с. 147 камандзір аднаго з атрадаў "службы парадку" названы Усеваладам Радзько. Правільна будзе пісаць "Родзька" (на рускай мове "Родько").

10. На с. 309 (Дадатак. Табліца Б.7) прыведзены пералік палявых і мясцовых камендатур на тэрыторыі Беларусі. А ў дужках стаяць гады — 1941—1945. Аднак пасля 1944 г. ніякіх палявых і мясцовых камендатур Германіі на тэрыторыі Беларусі не існавала.

11. Патрабуюць удакладнення подпісы да табліц у дадатку да кнігі. Так, не ўсім чытачам будзе зразумелы подпіс да табліцы Г. 7 на с. 323 "Численность контингента, годного к призыву в БКА (по состоянию на 12 марта 1944 года)".

І яшчэ. Сучасныя даследчыкі гісторыі Беларусі 1941—1945 гг. лічаць, што колькасць беларускіх калабарацыяністаў у гэты перыяд вагалася ад 60 да 150 тыс. чалавек. На жаль, у рэцэнзуемай кнізе не прыводзіцца выніковых колькасных даных па калабарацыянізму на беларускай зямлі.

Нягледзячы на гэтыя недахопы, можна лічыць, што А.В.Раманько напісаў цікавую, каштоўную і патрэбную кнігу па актуальнай тэме. Спадзяюся, што выданне "Коричневые тени в Полесье. Белоруссия 1941—1945" стане яшчэ адным крокам да разумення такой хваравітай, складанай і шматграннай праблемы, якой і па сённяшні застаецца праблема калабарацыянізму. Без яе праўдзівага раскрыцця нельга ўзнавіць аб'ектыўную гісторыю Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны.

**Эмануіл Іофе,**
*доктар гістарычных навук,*
*прафесар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка*